*І. М. Грамовіч*

# ШКОЛА НАРОДНЫХ СПЕВАЎ: СУЧАСНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

«Пад спевамі ў шырокім сэнсе слова неабходна разумець магчымасць голасу выказваць музыкальныя думкі. З гэтага пункту гледжання кожны чалавек з дастаткова развітым музыкальным пачуццём можа спяваць. Аднак спевы могуць быць вельмі рознымі як па прыгажосці і моцы гуку, так і па моцы ўздзеяння і выразнасці» [1, с.72]. У гэтым азначэнні Л. Б. Дзмітрыева заключаецца ўся сутнасць мастацтва спеваў. Перш-наперш, каб пачаць вучыцца спевам, неабходна асэнсаваць і ўдакладніць у практычным аспекце, што такое спевы. Наяўнасць добрага голасу і музыкальных здольнасцей яшчэ не даюць гарантыю поспеху ў майстэрстве спеваў. Па-сапраўднаму добра спяваць можа не кожны, за гэтым стаіць доўгая і адказная праца.

Народная манера выканання характарызуецца не толькі спосабам і спецыфікай спеваў, але і пэўнымі творчымі ўстаноўкамі, якія ўплываюць на маральнае і эстэтычнае выхаванне выканаўцы народнай песні. Натуральная прырода народ-ных спеваў спрыяе духоўнаму развіццю асобы і фарміруе інтарэс да народнапесеннага мастацтва. Прастата і даступнасць народнай песні дазваляюць дакрануцца да крынічнай чысціні зносін з цудоўным. Дзякуючы школе народных спеваў мы маем магчымасць сфарміраваць вобразнае мастацкае мысленне, а таксама раскрыць творчы патэнцыял спевака.

Беларусь – рэгіён самабытнай старажытнай культуры, дзе народнапесенныя традыцыі вельмі распаўсюджаны і захаваліся да сёння. Аднак праблема захавання, навучання і папулярызацыі народных спеваў не губляе сваёй актуальнасці ў наш час. Стварэнне школы народных спеваў, прафесійная падрыхтоўка спецыялістаў – складаная педагагічная задача сучасных музычных навучальных устаноў.

У педагагічнай практыцы кафедры беларускай народнапесеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў адзначым вельмі разнастайны склад абітурыентаў: розныя вакальныя даныя, вакальная падрыхтоўка і культура выканання. Недахопы вакальнай падрыхтоўкі праяўляюцца як у вакальна-тэхнічных адносінах, так і творча-мастацкіх: пляскаты,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зажаты ці насавы гук, крыклівыя спевы, увогуле адсутнасць культуры выканання. Падрыхтоўка спецыяліста-спевака патрабуе працяглай працы, індывідуальных заняткаў па пастаноўцы народнага голасу, якія прадугледжваюць ліквідацыю гэтых недахопаў, што вельмі складана, больш, чым навучанне з «чыстага ліста». Студэнт павінен прывыкнуць да новых адчуванняў, прыняць новыя патрабаванні і метады навучання.

На сучасным этапе застаецца спрэчным пытанне аб эталоне гучання народнага голасу. Вельмі добра, калі маладыя людзі захапляюцца аўтэнтычнымі спевамі, якія прыгожыя сваёй натуральнасцю і сапраўднасцю, чыстатой спеўнага стылю, непасрэднасцю і пранікнёнасцю. Больш за ўсё яны прыцягваюць сваёй праўдзівасцю, гістарычнай памяццю, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне. У захаванні такой песеннай спадчыны важная тая акалічнасць, што носьбіты традыцый выраслі і жывуць у натуральным асяроддзі, адкуль родам іх песні. Сучасная моладзь не можа дастаткова поўна акунуцца ў гэтае асяроддзе. Сляпое капіраванне спеваў сталых вяскоўцаў не заўсёды прыводзіць да якаснага пераймання традыцыі [3, с.14].

Адукацыйны працэс па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне народных спеваў у Беларусі бярэ пачатак прыкладна з 1977 г. У Мінскім інстытуце культуры ўпершыню пачалі рыхтаваць кіраўнікоў аматарскіх народных хароў.

Навучанне спецыялістаў будавалася на тых метадычных распрацоўках, якія былі створаны на падставе вопыту выкладчыкаў кафедры харавога дырыжыравання, вядомых хормайстраў, кіраўнікоў народных хароў, даследчыкаў фальклору, а таксама з улікам дасягненняў расійскай школы народных спеваў. Распачынаючы распрацоўку навукова-метадычных асноў навучання кіраўнікоў фальклорных калектываў па вакальна-харавых дысцыплінах, выкладчыкі кафедры абапіраліся на вялікі вопыт педагагічнай дзейнасці, метадычныя распрацоўкі прафесара Н. К. Мяшко, Н. В. Калугінай, В. Л. Шамінай, А. С. Кабанава і інш.

Нягледзячы на існаванне агульных рыс славянскіх культур, асаблівасці беларускай народнай манеры выканання бясспрэчныя. Назапашаныя фальклорныя песенныя матэрыялы, запісаныя ад таленавітых людзей, знаўцаў і носьбітаў мясцовага песеннага стылю, вельмі яскрава адлюстроўваюць мясцовую выканальніцкую манеру спеваў. Даследаванні беларускіх этнамузыколагаў Г. І. Цітовіча, З. В. Эвальд, З. Я. Мажэйкі, Т. Б. Варфаламеевай, В. І. Ялатава, У. І. Раговіча і інш. дазволілі вылучыць мясцовыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вакальныя «школы» народных спеваў, спецыфіку рэгіянальных выканальніцкіх манер.

На кафедры беларускай народнапесеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў пошукі шляхоў навучання будучых спецыялістаў, выканаўцаў народнай песні і кіраўнікоў фальклорных калектываў, пастаянна працягваюцца. Беларуская школа народных спеваў перажывае на сучасным этапе важную ступень свайго развіцця. Вывучэнне рэгіянальных асаблівасцей беларускай народнай песні дае падставу для стварэння навукова абгрунтаванай методыкі навучання народнай манеры спеваў у падрыхтоўцы кіраўнікоў фальклорных калектываў і выканаўцаў народнай песні.

У сучаснай педагагічнай практыцы імкненне перадаць традыцыю народных спеваў прывяло да стварэння розных методык навучання і розных кірункаў інтэрпрэтацыі беларускай народнай песні. Вучэбныя распрацоўкі кафедры маюць свой індывідуальны творчы твар і свае метады засваення народнапесеннага фальклору.

Ансамбль песні і танца «Валачобнікі» – самы старэйшы калектыў кафедры народнапесеннай творчасці, які прапагандуе стылізаваны фальклор. Бяссменны кіраўнік калектыву заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, прафесар С. І. Дробыш. У яго рэпертуары апрацоўкі беларускіх народных песень вядомых беларускіх кампазітараў М. Сіраты, Э. Наско, У. Грома, С. Дробыша і інш. Методыка работы ў гэтым калектыве накіравана на асэнсаванне асноўных прынцыпаў народнапесеннага выканання. Развучваюцца песні па нотных партытурах. Вялікая ўвага надаецца фарміраванню адзінай манеры спеваў, зладжанасці гучання, паўпрыкрытага гукаўтварэння, а таксама захаванню народнага каларыту і натуральнасці ў перадачы сэнсу беларускай народнай песні. Пастаянная рэпетыцыйная праца над правільным фарміраваннем гуку, чыстай інтанацыяй, дакладнай добрай дыкцыяй надае спевам прафесійнае гучанне.

У 1992 г. выпускнік кафедры беларускай народнапесеннай творчасці, цяпер прафесар кафедры У. К. Зяневіч стварыў вучэбны фальклорны калектыў «Грамніцы». З’явілася новае рашэнне ў выкананні народных песень: спалучэнне сучаснага аркестравага суправаджэння ў стылі фольк-ф’южн з абавязковым захоўваннем рэгіянальных песенных стыляў – такі творчы напрамак калектыву. У рэпертуары каляндарна-абрадавыя, сямейна-бытавыя, пазаабрадавыя песні ў апрацоўцы кіраўніка калектыву. Цудоўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апрацоўкі беларускіх народных песень з выкарыстаннем шырокай разнастайнай галасавой палітры (ад распеўнага адкрытага груднога гучання да мяккага камернага гукаўтварэння) дазваляюць гаварыць аб вялікім майстэрстве хормайстра і яго спевакоў.

Адраджэнне аўтэнтычнай манеры спеваў – такая мэта хору «Талака», якім кіруе выпускнік кафедры народнапесеннай творчасці, а цяпер загадчык кафедры этналогіі і фальклору, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт В. В. Калацэй. Калектыў вывучае і засвойвае бытавую манеру выканання і бытавыя танцы. Набліжэнне манеры спеваў да спеваў вясковых выканаўцаў, дакладная перадача атмасферы сапраўднага бытавання народнай песні – мэта, якую ставіць кіраўнік, пераносячы гэты пласт фальклорнай песеннай традыцыі на сцэнічную пляцоўку. Развучванне песеннага матэрыялу адбываецца шляхам праслухоўвання аўдыязапісаў, каб не толькі вывучыць меладычны малюнак, але адразу і пераняць манеру выканання і эмацыянальны настрой песні.

Асаблівай увагі заслугоўвае спецыялізацыя спеваў (народныя), якая адкрыта на кафедры беларускай народнапесеннай творчасці ў 1999 г. Працэс навучання адбываецца па спецыяльнай праграме, якая прадугледжвае авалоданне вакальна-тэхнічнымі навыкамі і ўменнямі, развіццё акцёрскага майстэрства, вывучэнне мясцовых песенных стыляў. Выкладчыкі пастаноўкі голасу абапіраюцца на лепшыя методыкі навучання, а таксама выкарыстоўваюць свой педагагічны вопыт, які заснаваны на выкананні асноўных правілаў тэхналогіі засваення тэхнікі народных спеваў: устойлівае і дынамічнае грудабрушное гукавядзенне на апоры; дакладнае і выразнае фарміраванне гуку (блізка, зверху, у адну кропку); размоўны асэнсаваны распеў на правільным гукавядзенні, адкрыты распеў галосных.

Навучанне народнай манеры спеваў накіравана перш-наперш на знаёмства са спецыфічнымі асаблівасцямі жанраў беларускай народнай песні і рэгіянальных гаворак, дасканалае засваенне асаблівасцей гукаўтварэння і эмацыянальнай падачы гуку.

Моцнасць уздзеяння песеннай мовы ў тых сэнсавых адценнях, якімі на належным узроўні павінен карыстацца сапраўдны спявак, дапамагае авалодаць майстэрствам перадачы сэнсу выконваемага твора. Вывучаючы тэкст народнай песні, мы адчуваем музычную стужку ў паэтычным тэксце, пластыку мовы. Правільнае вымаўленне, набыццё ведаў па фарміраванні і асаблівасцях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміравання галосных і зычных гукаў у спевах, выпрацоўка моўнай інтанацыйнай выразнасці спеваў – адзін з галоўных этапаў навучання.

Сапраўды, школа спеваў – гэта не проста перадача вывучанага меладычнага малюнку, а жывая натуральная і трапяткая музычная думка, мноства эмоцый, якія нараджаюцца ў спевака і перадаюцца слухачам. У сучаснай вузаўскай практыцы выкладчык імкнецца навучыць будучага выканаўцу «ствараць» песню. На занятках па пастаноўцы голасу вядзецца праца менавіта па развіцці і перадачы эмацыянальных перажыванняў, якія закладзены ў песенным матэрыяле. Найбольшую каштоўнасць спевы набываюць у тым выпадку, калі спявак выкарыстоўвае творчы падыход да выконваемага твора і здольны выявіць інтанацыйную выразнасць, багацце тэмбравых адценняў, акцёрскае майстэрства. Эмацыянальную сферу выканання народнай песні ён дапаўняе танцавальнымі рухамі, жэстамі, мімікай.

Стварэнне школы народных спеваў і распрацоўка новых методык прафесійнага навучання выканаўцаў народнай песні вызначаюць галоўную стратэгічную задачу выхавання самабытнага, высокапрафесійнага і шырокаадукаванага спецыяліста. Навучанне народнай манеры спеваў і падрыхтоўка спецыялістаў на кафедры беларускай народнапесеннай творчасці вядзецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу. Навучальны працэс будуецца ў шчыльнай сувязі з даследчай працай у галіне фальклору і вакальнай педагогікі. Аб гэтым сведчыць укараненне новых вучэбна-метадычных распрацовак і падыходаў у засваенні фальклорных традыцый, адкрыццё новых спецыялізацый.

1. *Дмитриев, Л. Б.* Основы вокальной методики / Л. Б. Дмитриев. – М.: Музыка, 2007.

3. *Мешко, Н. К.* Искусство народного пения: практическое руководство и методика обучения искусству народного пения / Н. К. Мешко. – М., 2000. – Ч. 2.

2. *Калугина, Н. В.* Методика работы с русским народным хором: учебник для муз. вузов / Н. В. Калугина. – М.: Музыка, 1977. – 71 с.

4. *Савельева, В. П.* Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров / В. П. Савельева // Вопросы хорового образования: сб. тр. / М-во культуры РСФСР, Гос. муз.-пед. ин-т. – М., 1985. – Вып. 77. – С. 120–128.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ